## ЦІШЭНБЕРГЕР ЭДУАРД ЭДУАРДАВІЧ



Рэзчык па дрэве, чаканшчык. Нарадзіўся 01.07.1941 г. ў г. Слаўгарад, Алтайскі край. Скончыў Пермскі будаўнічы тэхнікум. З 1972 года працаваў архітэктарам у Воранаўскім раёне. З дзяцінства любіў займацца разьбой па дрэве. Яго рукамі зроблены крэслы, кухонныя наборы, табурэткі, шкатулкі, карнізы і іншыя рэчы. З 1980 г. займаецца чаканкай. Найбольш вядомыя работы: “Зубр”, “Галава каня”, “Пурпурны ветразь”, “Ля самавара”, “Мадонна”, “Дзяўчына і конь”, “Дзед і Мішка” і іншыя. Удзельнічаў у абласных і раённых выстаўках народных майстроў. Узнагароджаны граматамі абласнога ўпраўлення культуры, раённага аддзела культуры, Ганаровай граматай за актыўны ўдзел у абласной выстаўцы работ самадзейных мастакоў і майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, прысвечаных 70-годдзю Кастрычніцкай рэвалюцыі.

**Бібліяграфія:**


1.Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Воранаўскага раёна / рэд.кал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск: БелЭн, 2004. – С. 499—500.